# Народная асвета

штомесячны навукова-педагагічны часопіс




5/2003

5-03

# Народныя гульні як сродак выхавання

**В. С. Болбас,**
прарэктар па вучэбнай рабоце Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Н. К. Крупскай,
кандыдат педагагічных навук,
**І. С. Сычова,**
саіскальнік кафедры педагогікі

Беларускія народныя гульні — адзін з самых старажытных і арыгінальных сродкаў выхавання. Іх выхаваўчае ўздзеянне кожны (няхай неўсвядомлена) адчуў на сабе. Фарміраванне асобы немагчыма без гульні, якая з'яўляецца неад'емнай часткай перыяду дзяцінства. Народныя гульні знаёмяць з культурай, традыцыямі, маральна-этычнымі нормамі грамадства. Для гарадскіх дзяцей, якія прыязджаюць у вёску і гуляюць з аднагодкамі, гэта яшчэ і ўрок роднай мовы. Якой бы простай ні была гульня, але яе зачын, асноўныя формулы, пытанні і адказы нельга змяняць. У гэтым народныя гульні набліжаюцца да замоў, дзе кожнае слова і яго месца ў сказе нясе не толькі семантычную, але і магічную нагрузку.

Даследчыкі адзначаюць, што «менталітэт як спецыфічная частка сацыяльнай інфармацыі мае асобныя каналы трансляцыі, якія дазваляюць яму перадавацца з пакалення ў пакаленне. Галоўнымі сярод іх з'яўляюцца прыроднае акружэнне, класічныя, сакральныя і іншыя шырока распаўсюджаныя тэксты, структура мовы, прадметы паўсядзённага ўжытку, тыповыя ўзоры паводзін» [1. С. 143]. Народныя гульні якраз і выконваюць ролю такога канала трансляцыі ў этнапедагогіцы: у даступнай, зразумелай для дзяцей форме з самага ранняга ўзросту перадаюць маральныя, працоўныя, эстэтычныя традыцыі, закладваюць асновы фізічнага і інтэлектуальнага развіцця. Гульня, па сутнасці, — гэта мудры запавет продкаў, які мае паслядоўны сцэнарый і не патрабуе абавязковага ўдзелу дарослага ці настаўніка, а лёгка арганізуецца самімі дзецьмі. Тое, што звыклыя для нашага народа гульні і забавы паступова выходзяць з ужытку, выклікае сур'ёзную занепакоенасць выхавальнікаў і псіхолагаў, бо гэта сігналізуе аб змене каштоўнасцей. Захапленне камп'ютэрнымі гульнямі ў рэшце рэшт прыводзіць да празмернай перавагі індывідуалізму над калектыўным ладам жыцця, фарміравання якасцей, не характэрных для нашага народа. Народная педагогіка не мае ўзроставых абмежаванняў для пачатку маральнага выхавання, яго асновы закладваюцца яшчэ да нараджэння, калі цяжарная жанчына выконвае шэраг прадпісанняў, каб дзіця не нарадзілася злодзеем, пераборлівым у ежы, капрызным, пазбаўленым уласнай волі ці з фізічным недахопам. Для самых маленькіх былі прызначаны калыханкі, пацешкі, лічылкі, забаўлянкі, дзе на простых і зразумелых прыкладах з жыцця звяроў і птушак асуджаюцца скваплівасць, гультайства, зайздрасць, у запамінальнай, вобразнай форме даюцца першыя паняцці аб адрозненнях дабра і зла.

Да выразна-павучальных можна аднесці гульню для маленькіх «Мышка», у якой Кот быццам бы даганяе Мышку за тое, што яна не жадае ні з кім дзяліцца сваёй здабычай. Такія паводзіны з'яўляюцца характэрнымі для дзяцей дашкольнага ўзросту, і народная педагогіка мае свае метады іх карэкціроўкі. Прымаючы ўдзел у гульні «Крумкач», сялянскія дзеці вучыліся ашчадным адносінам да сельскагаспадарчых раслін. Крумкач караў гуляючых за паламаную капусту, вырваную моркву, паталочаны гарох і інш. Неадабральныя адносіны да гультаёў выказаны ў гульні «Проса». Да вядомай казкі «Гусі-лебедзі» блізкая дзіцячая гульня «Іванка», дзе абыгрываецца сюжэт вызвалення лялькі з «хаты лесавіка», што сведчыць аб пераемнасці выхаваўчых мэт шэрага казак, гульняў, замоў. Але ў цэлым народным гульням у адрозненне ад казак або прыказак уласцівы ярка выражаны павучальны характар. У іх першапачаткова закладзены іншыя метады і прыёмы маральна-выхаваўчага ўздзеяння, бо гульні — частка дзіцячага светаўспрымання — пабудаваны на перайманні паводзін дарослых і старэйшых, больш умелых гульцоў, якія з'яўляюцца ідэалам для малодшых. У гульнях распаўсюджаны барацьба за лідэрства, імкненне перавысіць дасягненні таварышаў і свае ранейшыя, што патрабуе настойлівасці. Сістэматычнасць і паўтараемасць, прыслухоўванне да калектыўнай думкі дысцыплінуюць удзельнікаў, спрыяюць фізічнаму і духоўнаму развіццю, самаўдасканаленню. Выхаваўчы працэс адбываецца натуральным чынам, дзеці проста жывуць сваім жыццём і не адчуваюць на сабе ніякага педагагічнага ўздзеяння, што з'яўляецца адной з важнейшых умоў эфектыўнасці народнага выхавання.

Многія народныя гульні — «Кароль», «Рэдзька», «Мак», «Лянок» — імітуюць асноўныя сельскагаспадарчыя працэсы, гэтыя гульні рыхтуюць дзяцей да працы. Паказальна, што такія навыкі фарміруюцца не тлумачэннем ці іншымі вербальна-лагічнымі метадамі, а праз перайманне стэрэатыпаў рухаў у спалучэнні з танцам, песняй, мелодыяй. Рухавыя народныя гульні з элементамі інтэрмедыі, тэатралізаванага прадстаўлення садзейнічаюць абуджэнню прыродных задаткаў і іх рэалізацыі, фарміруюць эстэтычны густ. Каштоўнасць гульняў як аднаго з найбольш гуманных сродкаў народнай педагогікі заключаецца ў фарміраванні не сузіральна-пасіўнай, а актыўнай, дзейснай асобы.

Падзел значнай часткі народных гульняў на хлапечыя і дзявочыя сведчыць аб полаўзроставым выхаванні. З маленства хлопчыкі ўяўлялі сябе коннікамі, навыкі верхавой язды яны атрымлівалі ў час такіх нескладаных забаў, як «Язда на палачцы», «Конікі», у 10—12 гадоў — «Конная язда», «Стралянне і паляванне», у ходзе якіх выпрацоўвалася ўменне абыходзіцца з жывёлай, падпарадкоўваць яе сваёй волі, а таксама смеласць, адвага, спрыт. Сярод народных шмат гульняў з элементамі барацьбы, сілавымі прыёмамі, якія адпавядаюць асноўным відам спорту, напрыклад «Кавенькі» і «Сýка» (уяўляюць сабой народную разнавіднасць хакея), «Лёгкая атлетыка», «Ду-

жанне», «Перацяжкі», «Боркі», «Кулачкі», «Кулянне» і многія іншыя. Нярэдка ў іх прымалі ўдзел і дарослыя, што надавала гульням характар вясковага спартыўнага свята. Гэта дазваляе даследчыкам выказваць меркаванне, што ў час старадаўніх славянскіх ігрышчаў адбываліся спаборніцтвы, падобныя на грэчаскія Алімпійскія гульні, і сведчыць, што выхаванне будучых абаронцаў Айчыны ў мінулым знаходзілася пад кантролем сельскай абшчыны. Не выпадкова гульні, прызначаныя для хлопчыкаў-падлеткаў, носяць пераважна камандны, калектыўны характар, а фізічная загартоўка садзейнічае развіццю маральна-валявых якасцей асобы. Сілу, спрыт, кемлівасць, уменне адстойваць інтарэсы калектыву развіваюць многія гульні, у тым ліку «Гула», «Гаротнік», патрыятычную накіраванасць маюць гульні «Абарона Полацка», «Вежа», «Кароль», «Французы і беларусы», якія ўяўляюць сабой спаборніцтвы дзвюх каманд («арда» і «дружына», «французы» і «беларусы») з элементамі вайсковай падрыхтоўкі. У гульнях і нават іх назвах знайшла адлюстраванне гісторыя беларускага народа, які не быў заваёўнікам, але неаднойчы са зброяй у руках абараняў родную зямлю. Такім чынам, удзел у народных гульнях спрыяў выхаванню патрыятызму, фізічна загартоўваў моладзь.

Этнолагі характарызуюць беларусаў як людзей стрыманых, працавітых, настойлівых, здольных пераадольваць значныя цяжкасці. Можна з упэўненасцю сказаць, што гэтыя якасці характару закладваліся з дзяцінства, у тым ліку ў працэсе гульняў і падрыхтоўкі да іх. Напрыклад, гульні з мячом, зімовыя забавы на лёдзе патрабавалі не толькі трэніроўкі, але і самастойнага вырабу інвентару: мячоў, санак і канькоў. Цацкі рабілі з дрэва, гліны, кудзелі, саломы, воўны, хатніх рэчаў, што выйшлі з ужытку. Ліпавыя свістулькі, самаробныя лукі і пісталеты, лялькі з кукурузных пачаткаў ніколі не страцяць сваю каштоўнасць, бо гэта частка роднай прыроды, а мы — дзеці сваёй зямлі.

Для беларускіх народных гульняў не характэрны жорсткасць, бойкі да крыві, але, тым не менш, многія хлапечыя забавы насычаны сілавымі прыёмамі. Фізічнае ўздзеянне як элемент гульні загартоўвала волю, фарміравала звычку не баяцца і цярпліва пераносіць боль, пераадольваць няўдачы.

Ганьба, утоптванне шапкі ў зямлю, фізічнае пакаранне чакалі несумленнага ўдзельніка гульні, які свядома парушаў яе правілы, падрабляў косці, каменьчыкі, яйкі для гульні ў біткі. У разумных межах такія метады садзейнічалі ўстанаўленню справядлівасці, роўных для ўсіх умоў, прывучалі падпарадкоўвацца калектыву. У рытуале ўтоптвання шапкі таксама назіраецца сімвалічны сэнс: перанос на асабістыя рэчы маральных якасцей індывіда. Гэты прыём ужываўся ў народнай магіі, калі з дапамогай рэчаў, што належалі несумленнаму, разбэшчанаму чалавеку, наносілася шкода іншаму, напрыклад, разладжвалася вяселле. Утоптванне шапкі раўназначна самаму суроваму маральнаму асуджэнню — «страце твару».

На сённяшні дзень, калі лаянка і брыдкаслоўе ў асяроддзі падлеткаў сталі амаль нормай, уяўляе цікавасць гульня «Чачары». Яна складаецца з дзеянняў і прыпеваў, што асуджаюць грубіяна. «Калі хлопчыку давядзецца непрыстойна выказацца ўслых у прысутнасці сяброў, то яны крычаць: «Чуру, маё зіляно!» І затым хутка бяруць зялёную траву або ліст з дрэва. Віноўнага абкружаюць з усіх бакоў і па чарзе цягнуць яго за валасы» [2. С. 440]. Як бачна з гэтага прыкладу, для барацьбы з маральнымі заганамі, брыдкаслоўем народная педагогіка дапускала выкарыстанне фізічнага ўздзеяння, асуджэння з боку дзіцячага калектыву, а не толькі дарослых, што значна ўзмацняла выхаваўчы патэнцыял гульняў. У мужчынскім характары цаніліся выхаванасць, далікатнасць. Грубасць жа ўспрымалася не толькі як прыватны выпадак, асабістая загана, але і сведчанне непавагі да таварышаў, парушэнне агульнай гармоніі светабудовы, грэх у дачыненні да прыроды, кожнага зялёнага лісточка.

Фальклор сведчыць, што галоўнай каштоўнасцю народа, захавальніцай норм паводзін і маральных традыцый лічылася дружная, мнагадзетная сям'я. Да засваення гэтай ісціны дзеці далучаліся вельмі рана, на стварэнне падмурка для будучага сумеснага жыцця быў, па сутнасці, накіраваны ўвесь працэс выхавання. Напрыклад, вядома гульня «Вяселле», у якой прымалі ўдзел дзеці 4—5 гадоў: выбіралі жаніха і нявесту, наладжвалі імправізаваную ўрачыстасць. Сярод дзяўчынак ад 5 да 10 гадоў бытавала гульня «Дзеці». Гэта — гульня-спаборніцтва: хто паспее хутчэй узяць на рукі меншае дзіця. Дзяўчынка з дзіцем называлася «маткай», а без дзіцяці — «ялаўкай». [2. С. 316]. Ці не адсюль, з няхітрай забавы сялянскіх дзяўчынак (якая тым не менш мае лёсавызначальны сэнс, абуджае натуральнае жаданне ў будучым мець дзяцей), бярэ пачатак вобраз беларускай мадонны ў творчасці Максіма Багдановіча, трапяткія адносіны да сям'і ва ўсіх славянскіх народаў?

Акрамя таго, у большасці народных гульняў «маткай» называецца вядучая – галоўная дзеючая асоба гульні. Гэта падкрэслівае старажытнае паходжанне многіх гульняў, іх сакральную сувязь са здольнасцю жанчыны прадаўжаць род, клапаціцца аб патомстве і выхоўваць дзяцей, несці адказнасць за іх паводзіны, а таксама з урадлівасцю зямлі (у беларусаў нярэдка «маці-зямля»). Не выпадкова нават звычайная «Гойданка» лічылася ў народзе не проста забавай, а «для таго, каб на той год рос лён доўгі і моцны» [2. С. 111]. Адпаведны сэнс мелі і «Ваджэнне Казы», «Карагоды»: «А дзе карагод не бывае, там жыта вылягае» [2. С. 160]. Відавочна, што такую ж ролю раней выконвалі гульні, звязаныя з імітацыяй працоўных працэсаў. Прычым удзел дзяцей і моладзі быў абумоўлены існаваўшым у народзе перакананнем, што гульні могуць уплываць на ўраджай, бо маюць ярка выражаную магічную сілу. Такім чынам, юныя ўдзельнікі пераконваліся ў незвычайным, магічным уздзеянні слова, танца, мелодыі, вучыліся ставіцца да іх з асаблівай павагай і ашчаднасцю. Аб пэўнай містычнасці светапогляду продкаў гаворыць гульні «Поцем», «Язда ў паветры», шматлікія спосабы варажбы. Вельмі блізкія да замоў, звязаныя з верай чалавека ў магчымасць уздзейнічаць на з'явы прыроды, народныя гульні «Вызыванне і закліканне дажджу», «Аб надвор'і», «У грыбах», «Зязюля». Гэта адлюстроўвае лад жыцця і спосаб мыслення народа як блізкія да прыроды, цесна звязаныя з касмічнымі працэсамі. Агульнавядома абрадавая гульня «Завіванне і развіванне вянкоў». Пакінуўшы на бярозе свой вянок, каб даведацца аб далейшым лёсе, неабходна было абавязкова вярнуцца і развіць яго, інакш дрэва магло па-

крыўдзіцца. Анімізм — абагаўленне, надзяленне прыроды ўласцівасцямі жывой істоты, у выхаванні даваў добры плён, забяспечваў гуманныя адносіны да яе. Фарміраванне экалагічнага мыслення, якое можна лічыць працягам гэтай традыцыі, сёння замаруджваецца. Узнаўленне шэрага народных гульняў магло б стаць спрыяльным фактарам для ўсведамлення дзецьмі сваёй цеснай сувязі з прыродай.

Прынцып прыродазгоднасці з'яўляўся падмуркам фарміравання маральных і фізічных якасцей. Паводле ўяўлення продкаў, лёс чалавека, яго жыццё залежалі ад навакольнай прыроды. На Купалле дзяўчаты хадзілі ў жыта «долю гукаць». «Лажыліся долу і казалі:

Долюшка-доля, адгукніся!

Доля, гу...» [2. С.187].

Жыццё чалавека ўспрымалася як наканаванасць, дадзеная вышэйшымі сіламі за маральную чысціню, цнатлівасць, дабрыню. І сёння такое тлумачэнне не адмаўляецца прадстаўнікамі філасофскіх і ізатэрычных вучэнняў, большасцю рэлігій. Мудрасць продкаў бачыцца ў псіхалагічнай падрыхтоўцы моладзі да складанасцей жыцця, фарміраванні адпаведных рыс характару. Калі замужжа складвалася не вельмі ўдала, то было прынята шукаць прычыны ў сваіх учынках, паводзінах, а не наракаць на долю. Цярплівасць, здольнасць даравацъ былі і ёсць неабходныя якасці жанчыны, гарантыя стабільнасці сям'і. Яны складваліся на працягу ўсяго жыцця ў працэсе традыцыйных заняткаў, абрадаў, гульняў і забаў, падтрымліваліся грамадскай думкай.

Народная педагогіка вельмі сур'ёзна ставілася да падрыхтоўкі моладзі да сямейнага жыцця. Яе асноўныя палажэнні не распрацаваны тэарэтычна, але маюць выразную практычную накіраванасць. Так, гульні, паступова ўскладняючыся з узростам, былі, калі карыстацца сучаснай тэрміналогіяй, і дыскатэкай, і бюро знаёмстваў. Калетыўная мараль асуджала людзей без пары, адзінокіх, і мела свае метады заахвочвання моладзі да пошуку жаніхоў і нявест. Народныя гульні «Цяганне калоды», «Захоп у ступу» праходзілі весела, з гумарам і пачастункамі. Прадугледжваўся выкуп рэчаў, захопленых у дзяўчат і хлопцаў, якія запазніліся са стварэннем сям'і.

Многія гульні — «Проса», «Рэдзька», «Мак», «Ручаёк», «Падушачка» — заканчваліся песнямі і сумеснымі танцамі, мелі выразную эстэтычную накіраванасць, праслаўлялі прыгажосць чалавечых пачуццяў. Да найбольш старажытных даследчыкі адносяць «Яшчар», «Олей», «Тур».

«Бяры сабе паненку,

Каторую хочаш.

Ці — хораша ходзе,

Ці — работку робе» [2. С. 88], —

пяюць удзельнікі гульні «Яшчар», выказваючы народнае разуменне ідэалу дзяўчыны, дзе працавітасць з'яўляецца вышэйшай маральнай якасцю і цэніцца нароўні са знешняй прыгажосцю. Адпаведную характарыстыку атрымлівае і хлопец: «... і прыгожы, і гаваркі, і ў полі работнік, пашукаць такога» [2. С. 208].

Да нашага часу, асабліва на Віцебшчыне, захавалася архаічная гульня «Жаніцьба Цярэшкі», што ўяўляе сабой сапраўдную рэпетыцыю шлюбнага абраду і мае выразную мэту звесці, пазнаёміць маладых. Ролю бацькі і маці, якія давалі благаславенне на шлюб, выконвалі дарослыя, жанатыя людзі. Моладзь жа разбівалася на пары: муж і жонка. Уяўляе цікавасць працэс выбару, у якім першынство належала юнакам: «Кожны з хлопцаў або захоплівае сілаю намечаную ім дзяўчыну, або падыходзіць да яе любоўна і надзявае ёй на галаву сваю шапку» [2. С. 66]. Калі дзяўчына не задаволена хлопцам, то яна скідвае шапку і ўцякае, пакідаючы за сабой апошняе слова. Гульню «Жаніцьба Цярэшкі» самі інфарматары часам характарызуюць як нясціплую, адзначаючы, што назіраліся асобныя выпадкі маральнага падзення, але многія пары сапраўды пазней заключалі шлюбы. У цэлым жа ў народзе забава не асуджалася. На першае месца народная педагогіка ставіць дэталёвую адпрацоўку сацыяльных роляў чалавека ў грамадстве і клапоціцца пра заключэнне шчаслівага шлюбу. «Жаніцьбу Цярэшкі» можна лічыць апошнім этапам забаў і гульняў моладзі, калі заканчвалася юнацтва і наступала пара самастойнага жыцця.

Але на гэтым працэс гульняў не спыняўся, толькі набываў іншы характар. Напрыклад, у карнавальнай гульні «Дзяленне быка» асуджаліся маральныя заганы дарослых членаў сям'і. Яна суправаджалася сатырычна-павучальнымі прыпеўкамі: «Бандысю трыбух: у гарэлцы пратух; Петрыку рабро: любіць чужое дабро» [2. С. 444], іншымі як адмоўнымі, так і станоўчымі характарыстыкамі. Калектыўная думка, выказаная ў нетрадыцыйнай форме, спрыяла перавыхаванню не толькі дзяцей, але і людзей сталага ўзросту, замацоўвала правільныя, станоўчыя паводзіны.

Сялянскія дзеці, як адзначаецца ў большасці крыніц, рана далучаліся да працы, і час для гульняў у іх быў абмежаваны. Таму большасць народных гульняў добра распрацаваны, маюць здольнасць захапіць дзяцей любога ўзросту, аб'яднаць у калектыў, уратаваць ад шкоднай звычкі бадзяцца без справы, прадухіліць бойкі, іншыя згубныя заняткі. Народныя гульні запамінаюцца адметнасцю і нацыянальным каларытам, садзейнічаюць гарманічнаму развіццю асобы. Абуджаючы фантазію, вобразнае мысленне, пачуццё рытму і прыгажосці, садзейнічаюць развіццю інтэлекту, логікі, здольнасці да пераймання, а значыць, і навучання.

Сённяшнія дзеці, у параўнанні з папярэднімі пакаленнямі, маюць вельмі абмежаваную магчымасць удзельнічаць у народных гульнях. Таму выхавальнікам трэба займацца іх арганізацыяй і прапагандай, зрабіць так, каб беларускія народныя гульні не заставаліся за межамі выхаваўчага працэсу. Яны — неабходная ўзроставая прыступка ў засваенні кожным маленькім чалавекам маральнаэтычных каштоўнасцей свайго народа, таму не могуць быць заменены нават самымі лепшымі ўзорамі масавай культуры.

## ЛІТАРАТУРА

1. **Кукушкин В. С., Столяренко Л. Д.** Этнопедагогика и этнопсихология. Ростов-на-Дону, 2000.
2. **Гульні, забавы, ігрышчы** / Склад. А. Ю. Лозка. 2-е выд. Мн., 2000.
3. **Садохин А. П., Грушевицкая Т. Г.** Этнология. М., 2000.
4. **Вількін Л. Р.** Народныя гульні // Беларуская мова і літаратура ў школе. 1989. № 12.
5. **Ракава Л. В.** Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы. Мн., 2000.